богарис 2с

Установа адукацыі

«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай
рабоце ўстановы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай»
____________ К.І. Галяшова
«18» __12__ 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-335/23/уч.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
**7-07-0712-01 «Электраэнергетыка і электратэхніка»**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарта спецыяльнай вышэйшай адукацыі ОСВО 7-07-0712-01-2023 і вучэбнага плана для спецыяльнасці 7-07-0712-01 «Электраэнергетыка і электратэхніка», рэгістрацыйны №16-23/уч. ФКНЭ ад 04.04.2023 г.

СКЛАДАЛЬНІК:
Т.Р. Багарадава, дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДЛЯ ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол №_17_ ад «_05_»__12__2023 г.)

Метадычнай камісіяй факультэта камп'ютарных навук і электронікі ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № __4__ ад «_14_» __12__ 2023 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская мова (культура маўлення) – вучэбная дысцыпліна, якая дапамагае студэнтам далучыцца да багаццяў нацыянальнай культуры, сфарміраваць камунікатыўна развітую асобу, здольную наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай сферы, перакладаць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя і навуковыя тэксты, весці дзелавую дакументацыю, выступаць з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі і інш.

Агульныя патрабаванні да фарміравання кампетэнцыі студэнта ў працэсе вывучэння дысцыпліны вызначаюцца прынцыпамі

- гуманізацыі як прыярытэтным прынцыпам адукацыі, якія забяспечваюць асобасна-арыентаваны характар адукацыйнага працэсу і творчую самарэалізацыю выпускніка;
- фундаменталізацыі, якія спрыяюць арыентацыі зместу дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла на выяўленне сутнасных асноў і сувязей паміж разнастайнымі працэсамі навакольнага свету, прыродазнаўча- навуковым і гуманітарным веданнем;
- кампетэнтнаснага падыходу як вызначальным сістэму патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу, накіраваных на павышэнне ролі самастойнай працы студэнтаў, мадэлюе сацыяльна-прафесійныя праблемы і шляхі іх вырашэння, якая забяспечвае фарміраванне ў выпускнікоў здольнасці дзейнічаць у зменлівых жыццёвых абставінах;
- сацыяльна-асобаснай падрыхтоўкі, якія забяспечваюць фарміраванне ў студэнтаў сацыяльна-асобаснай кампетэнтнасці, заснаванай на адзінстве набытых гуманітарных ведаў і ўменняў, эмацыянальна-каштоўнасных адносін і сацыяльна-творчага вопыту з улікам інтарэсаў, патрэбаў і магчымасцей навучэнцаў;
- міждысцыплінарнасці і інтэгратыўнасці сацыяльна-гуманітарнай адукацыі, рэалізацыя якога забяспечвае цэласнасць вывучэння гуманітарных ведаў і іх узаемасувязь з сацыяльным кантэкстам будучай прафесійнай дзейнасці выпускніка.

**Асноўная мэта выкладання дысцыпліны** – выпрацоўка, замацаванне практычных уменняў і навыкаў граматнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай, развіццё моўна-эстэтычнага густу студэнтаў, звязанага з чысцінёй і правільнасцю мовы, пашырэнне і ўзбагачэнне прафесійнага лексічнага запасу будучых спецыялістаў, выпрацоўка ўмення пактычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– сфарміраваць у студэнтаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;

– даць студнтам неабходную сістэму ведаў аб лексічным складзе, тэрміналогіі і маўленчай культуры;

– дапамагчы студэнтам усвядоміць месца беларускай мовы ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен набыць наступную **ўніверсальную кампетэнцыю:**

УК-10. Выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;
– функцыі беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў;
– сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы;
– пэўны набор прафесійнай лексікі;
– тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці;

**умець:**

– адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю;
– перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты;
– выконваць тэсты і тэставыя заданні, якія садзейнічаюць замацаванню вучэбнага матэрыялу;

**валодаць:**

– моўнай сітуацыяй у Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе;
– навыкамі пісьмовага афармлення дзелавой камунікацыі на беларускай мове;
– эфектыўнымі прыёмамі моўных паводзін у розных сітуацыях прафесійных і дзелавых зносін.

Форма атрымання адукацыі – дзённая.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца: усяго вучэбных гадзін – 52, аўдыторных – 32 гадзіны, з іх практычныя заняткі – 32 гадзіны.

Самастойная праца студэнтаў –20 гадзін.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на 1 курсе ў 2 семестры.

Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Модуль 1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.**

**Тэма 1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.**

Уводзіны ў дысцыпліну «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Месца курса ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук, яго сувязь з іншымі дысцыплі- намі (гісторыяй літаратурнай мовы, лексікалогіяй, стылістыкай і культурай маўлення).

Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця. Старабеларуская літаратурная мова XIV–XVI стст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім. Новая (сучасная) беларуская мова XIX – пачатку XX стст. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI стст.

**Тэма 2. Сучасная беларуская мова.**

Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў. Беларуская нацыянальная мова і яе формы. Сацыяльна-палітычныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы на сучасным этапе. Дзяржаўная мова і дзяр- жаўнае двухмоўе (праблема беларуска-рускай інтэрферэнцыі. Закон Рэс- публікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь».

**Модуль 2. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.**

**Тэма 1. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.**

Лексікалогія як прадмет. Лексічнае значэнне слова. Тыпы лексічных значэнняў. Лексічная сістэма беларускай мовы.

Паняцці «тэрмін», «тэрміналагічная сістэма», «тэрміналогія». Галіновыя тэрміналагічныя сістэмы. Узаемасувязь тэрміналагічнай і агульнаўжывальнай лексікі (тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя). Асаблівасці тэрмінаўтварэння. Тэрміны, запазычаныя з іншых моў, іх асваенне беларускай мовай.

Крыніцы фарміравання беларускай тэрміналогіі. Беларуская навуковая тэрміналогія на сучасным этапе.

**Тэма 2. Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы.**

Лексіка спрадвечна беларуская і запазычаная. Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: актыўная і пасіўная лексіка. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі.

**Тэма 3. Прафесійная лексіка.**

Прафесійная лексіка (адміністрацыйнае кіраванне, дзяржава і грамадства, дзяржава і права, маркетынг і менеджмент). Лексічныя, фразеалагічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. Лексічны практыкум (пераклад прафесійных тэкстаў).

**Тэма 4. Лексікаграфія.**

Прадмет і задачы лексікаграфіі. Тыпы слоўнікаў. Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі, іх роля і месца ў лексікаграфічнай сістэме беларускай мовы. Сістэма падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў.

**Модуль 3. Асаблівасці суіснавання беларускай і рускай моў у розныя гістарычныя перыяды.**

**Тэма 1. Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму.**

Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі.

Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адметнасць структуры словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.

**Тэма 2. Арфаэпічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.**

Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім.

Назоўнік. Несупадзенне ў родзе, ліку, скланенні. Асаблівасці скланення прозвішчаў, імёнаў, геаграфічных назваў. Прыметнік. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыметнікаў. Выкарыстанне элятыўных формаў у беларускай і рускай мовах. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне. Займеннікі. Асаблівасці ўжывання асабовых, азначальных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. Лічэбнік. Скланенне лічэбнікаў і асаблівасці іх ужывання з назоўнікамі.

**Тэма 3. Арфаграфічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы (працяг вывучэння).**

Дзеяслоў. Спецыфіка спражэння. Ужыване суфіксаў дзеясловаў. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова. Асаблівасці і утварэння і ўжывання ў беларускай мове. Спосабы перадачы дзеепрыметнікаў у складзе тэрміналагічных словазлучэнняў пры перакладзе на беларускую мову. Прыслоўе. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання формаў ступеней параўнання ў адрозненне ад рускай мовы.

**Модуль 4. Стылістыка і культура мовы.**

**Тэма 1. Функцыянальныя стылі маўлення.**

Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў. Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі (уласна навуковы (акадэмічны), навукова-папулярны, вучэбна-навуковы і інш.). Функцыі навуковага стылю і яго адметныя лексічныя, марфалагічныя і сітаксічныя асаблівасці. Афіцыйна- справавы стыль і яго асноўныя падстылі (канцылярскі, юрыдычны, дыпламатычны). Функцыі афіцыйна-справавога стлю і яго характэрныя асаблівасці. Публіцыстычны стыль і яго асноўныя асаблівасці. Узаемапранікненне стыляў.

**Тэма 2. Навуковы стыль.**

Асноўныя рысы навуковага стылю. Моўныя сродкі навуковага стылю. Паняцце аб прадмове навук: матэматыкі, эканомікі, права, медыцыны і г.д. Рэальны слоўнік кожнай прадмовы. Выкарыстанне невербальных сродкаў (табліцы, графікі, схемы).

Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення, іх афармленне. Абзац як структурная адзінка тэксту. Цытаты і спасылкі, ях афармленне.

**Тэма 3. Сістэма жанраў навуковай літаратуры.**

Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (артыкул, даклад, рэферат, анатацыя, тэзісы, рэзюме і інш.).

Прынцыпы разгортвання інфармацыі ў навуковым тэксце. Выдзяленне асноўнай і дадатковай інфармацыі.

Кампазіцыйная і лінгвістычная арганізацыя анатацыі, рэферата. Віды анатацый. Складанне анатацый тэкстаў па спецыяльнасці па вызначаных мадэлях (дзе?; аналізуецца што?; адзначаецца што?; падкрэсліваецца што?).

Жанр рэзюме і яго асаблівасці.

Тыповыя лексіка-сінтаксічныя канструкцыі рэфератаў, тэзісаў. Лексіка-граматычныя мадэлі выражэння ацэнкі зместу працы, мовы, стылю; афармленне вывадаў, высноў.

Практыкум: напісанне анатацыі, рэферата, рэзюме.

**Тэма 4. Афіцыйна-справавы стыль.**

Асноўныя рысы афіцыйна-справавога стылю. Моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю. Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. Загаловак і іншыя рэквізіты як элементы тэксту службовага дакумента. Роля клішыраваных выразаў у арганізацыі тэксту службовых дакументаў.

**Тэма 5. Афіцыйна-справавыя дакументы.**

Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, тлумачальная запіска, кантракт, справавыя лісты і інш.). Групы афіцыйна-справавых дакументаў (асабістыя, распарадчыя, адміністрацыйна-арганізацыйныя, інфармацыйна-даведачныя, справавыя лісты, фінансавыя і уліковя дакументы), іх кампазіцыйнае і моўнае афармленне. Віды запісу тэкстаў: лінейны запіс, трафарэт, анкета, табліца, тэкст-аналаг. Правілы афармлення дакумента. Выкарыстанне скарачэнняў у тэкстах дакументаў. Паняцце рэквізіта, фармуляра, бланка.

Спосабы выкладання матэрыялу ў дакуменце: канстатацыя, паведамленне, апісанне. Патрабаванні да іх. Суразмернасць частак дакумента. Рубрыкацыя: абзацы, намараванне, загалоўкі, падзагалоўкі. Практыкум па скаданні афіцыйных папер.

## Модуль 5. Культура прафесійнага маўлення.

**Тэма 1. Мова і маўленне.**

Мова і маўленне. Віды, тыпы і адзінкі маўлення. Маўленне – маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне.

Паняцце культуры маўлення. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення, дарэчнасць, вобразнасць.

**Тэма 2. Дакладнасць выказвання і моўныя нормы.**

Правільнасць маўлення і моўныя нормы (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і г.д.). Тыповыя маўленчыя памылкі іх прычыны, спосабы выпраўлення. Роля СМІ і мастацкай літаратуры ў фарміраванні стэрэатыпаў паводзін, культуры. Тэхніка і выразнасць маўлення (голас і маўленчае дыханне, дыкцыя, інтанацыя і інш.).

Узаемадзеянне вербальных і невербальных (жэсты, міміка, рухі) сродкаў маўленчай дзейнасці.

Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўня якасці – паказчыкі паспяховага выступлення.

**Тэма 3. Маўленчы этыкет і культура зносін.**

Этыкет маўлення. Культура дыскусійна-палемічнага маўлення. Спрэчка-дыскусія-палеміка-дыспут-дэбаты, іх паняце і характарыстыка. Віды і прымы спрэчкі. Выкарыстанне ацэначных моўных сродкаў у спрэчцы.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

### Дзённая форма атрымання адукацыі

| Нумар модуля (раздзела), тэмы, заняткаў | Назва модуля (раздзела), тэмаў | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнта | | |
| 1. | **Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей** | | **4** | | | | |
| 1.1. | **Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей**<br>1. Уводзіны ў дысцыпліну «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».<br>2. Мова і соцыум.<br>3. Функцыі мовы ў грамадстве.<br>4. Паходжанне беларускай мовы і асноўныяэтапы яе развіцця. | | 2 | | | [6], [17] | Вуснае апытанне |
| 1.2 | **Сучасная беларуская мова**<br>1. Беларуская мова – форма нацыянальнайкультуры беларусаў. | | 2 | | | [13], [17] | Пісьмовае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Сацыяльна-палітычныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы на сучаснымэтапе. | | | | | | |
| 2 | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.** | | **8** | | | | |
| 2.1 | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы**<br>1. Тыпы лексічных значэнняў.<br>2. Паняці «тэрмін», «тэрміналагічная сістэма», «тэрміналогія».<br>3. Асаблівасці тэрмінаўтварэння, іх крыніцы. | | 2 | | | [6], [12], [13] | Вуснае апытанне |
| 2.2 | **Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы**<br>1. Лексіка спрадвечна беларуская і запазычаная.<br>2. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання, актыўная іпасіўная лексіка. | | 2 | | | [6], [13] | Самастойная работа (праца з прафесій-нымі тэкстамі) |
| 2.3 | **Прафесійная лексіка**<br>1. Спецыяльная лексіка як частка лексічнайсістэмы беларускай літаратурнай мовы.<br>2. Лексічныя, фразеалагічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. | | 2 | | | [3], [12], [13], [16] | Вуснае апытанне Пераклад прафесійных тэкстаў* |
| 2.4 | **Лексікаграфія**<br>1. Тыпы слоўнікаў.<br>2. Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі.<br>3. Сістэма падачы тэрмінаў у слоўніках. | | 2 | | | [6], [14] | Складанне студэнтамі прафесіяналь-ных слоўнікаў Рэфераты* |
| 3 | **Асаблівасці суіснавання беларускай і рускай моў у розныя гістарычныя перыяды.** | | **6** | | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1 | **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму**<br>1. Паняцце білінгвізму.<br>2. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму,віды інтэрферэнцыі. | | 2 | | | [1], [6], [9] | Пісьмовае апытанне |
| 3.2 | **Арфаэпічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы**<br>1. Арфаэпічныя нормы і прычыны іх парушэння.<br>2. Назоўнік. Асаблівасці скланення прозвішчаў,імёнаў і геаграфічных назваў.<br>3. Скланенне займеннікаў, лічэбнікаў; асаблівасці іх ужывання. | | 2 | | | [6], [11] [10], [14] | Вуснае апытанне |
| 3.3 | **Арфаграфічныя і марфалагічныя нормыбеларускай літаратурнай мовы (працяг вывучэння)**<br>1. Спецыфіка спражэння дзеясловаў.<br>2. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе, асаблівасці іхутварэння і ўжывання ў мове. | | 2 | | | [6], [11], [18], [10], [14] | Вуснае апытанне Пераклад* |
| .4 | **Стылістыка і культура мовы** | | **8** | | | | |
| 4.1 | **Функцыянальныя стылі маўлення**<br>1. Класіфікацыя функцыянальных стыляў.<br>2. Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі.<br>3. Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныяпадстылі. | | 2 | | | [20] | Вуснае апытанне |
| 4.2 | **Навуковы стыль**<br>1. Асноўныя рысы і моўныя сродкі навуковагастылю.<br>2. Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і | | 2 | | | [6], [20] | Вуснае апытанне Пераклад навуковага тэксту* |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вуснага выступлення, іх афармлення. | | | | | | |
| 4.3 | **Сістэма жанраў навуковай літаратуры**<br>1. Жанравая разнастайнасць навуковага стылю.<br>2. Прынцыпы разгортвання інфармацыі ўнавуковым тэксце.<br>3. Кампазіцыйная і лінгвістычная арганізацыя анатацыі, рэферата, артыкула, рэзюме і г.д. | | 2 | | | [3], [10], [14] | Напісанне анатацыі, рэферата, рэзюме * |
| 4.4 | **Афіцыйна-справавы стыль. Афіцыйна-справавыя дакументы.**<br>1. Асноўныя рысы і моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю.<br>2. Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>3. Віды афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>4. Групы афіцыйна-справавых дакументаў | | 2 | | | [3] , [10], [20] | Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў |
| 5 | **Культура прафесійнага маўлення.** | | **6** | | | | |
| 5.1 | **Мова і маўленне**<br>1. Віды, тыпы і адзінкі маўлення.<br>2. Прафесійна арыентаванае маўленне.<br>3. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення. | | 2 | | | [1], [9], [14] | Вуснае апытанне |
| 5.2 | **Дакладнасць выказвання і моўныя нормы**<br>1. Правільнасць выказвання і моўныя нормы.<br>2. Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны,спосабы выпраўлення. | | 2 | | | [1], [9], [13] ,<br>[9], [12] | Праслухоўванне і аналіз навуковых паведамленняў і публічных прамоў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | студэнтаў* |
| 5.3 | **Маўленчы этыкет і культура зносін (дыскусія)**<br>1. Што уключае ў сябе паняцце «моўныэтыкет»?<br>2. Вашы меркаванні пра культуру ў грамадстве,культуру свайго асяроддзя, сваю культуру?<br>3. Які стыль кіраўніка для вас прыемлімы: дырэктыўны (аўтарытарны)? дэмакратычны (калегіяльны)? ліберальны (анархічны)? і інш. | | 2 | | | [8] | Дыскусія |
| | **УСЯГО:** | | **32** | | | | |

*Мерапрыемствы бягучага кантролю

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**


1. Венедзіктаў, С.В. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэбны дапаможнік / С. В. Венедзіктаў, С. І. Даніленка. - Минск : Вышэйшая школа, 2019. - 126, [1] с. - (Для студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі). - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для курсантаў і студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі па юрыдычных спецыяльнасцях.
2. Губская, В.М. Беларуская мова для эканамістаў : вучэбны дапаможнік / В. М. Губская, І. І. Шматкова. - Мінск : РІВШ, 2020. - 131 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі па эканамічных спецыяльнасцях
3. Запрудскі, С.М. Нарысы гісторыі беларускага мовазнаўства XIX стагоддзя : дапаможнік / С. М. Запрудскі ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2020. - 193 с. - Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі,якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія", 1-21 05 02.
4. Каценка, А.В. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэбны дапаможнік / А. В. Каценка, В. К. Мароз ; Акадэмія Міністэрства ўнутранных спраў Рэспублікі Беларусі. - 2-е выданне, перагледжанае. - Минск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2018. - 137 с. - (Для студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі). - Библиогр. : с. 109. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для курсантаў і студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі па юрыдычных спецыяльнасцях.
5. Латушка, Г.П. Беларускія выразы згоды і нязгоды : вучэбна-метыдычны дапаможнік / Г. П. Латушка ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2020. - 134 с. - Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-21 05 01 "Беларуская філалогія", 1-21 05 02 "Русская філалогія (па напрамках)", 1-21 05 04 "Славянская філалогія" .
6. Ляшчынская, В.А. Ідыяматыка беларускай мовы ў лінгвакультуралагічным асвятленні : вучэбны дапаможнік / В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. - Мінск : РІВШ, 2019. - 249 с. - Бібліягр. : с. 223-235. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў установаў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці "Беларуская філалогія (па напрамках)".

7. Маршэўская, В.В. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для юрыстаў і эканамістаў : вучэбны дапаможнік / В. В. Маршэўская, А. С. Садоўская. - Мінск : РІВШ, 2020. - 231 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па юрыдычных і эканамічных спецыяльнасцях.
8. Свістунова, М.І. Гістарычная марфалогія беларускай мовы : вучэбны дапаможнік / М. І. Свістунова, Г. К. Ціванова ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2018. - 198 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці "Беларуская філалогія (па напрамках)".
9. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэбны дапаможнік / Д. В. Дзятко [и др.] ; пад рэдакцыяй Д.В. Дзятко. - Мінск : Вышэйшая школа, 2017. - 588 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па філалагічных спецыяльнасцях.
10. Цыхун, Г.А. Прастора мовы. Моўныя сувязі. Гісторыя слоў : выбраныя працы / Г. А. Цыхун ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа ; укладальнік Я.В. Волкава. - Мінск : Беларуская навука, 2018. - 314, [1] с.
11. Янкоўскі, Ф.М. Гісторыя беларускай мовы : гістарычная граматыка / Ф. М. Янкоўскі ; навуковы рэдактар Д.В. Дзятко. - Наваполацк : Вышэйшая школа, 2019. - 263 с. - Библиогр. : с. 256-257. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па філалагічных спецыяльнасцях.

**Дадатковая:**

12. Беларуская мова, інтэрнет і камп'ютэр : матэрыялы круглага стала міжнар. сімпозіума "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі" (20 мая 2002 г., г. Мінск) / Таварыства бел. мовы імя Ф. Скарыны ; склад. С. Кручкоў. - Мінск : БелСаЭС Чарнобыль, 2002. - 66, [2] с. : іл.
13. Буракова, М. У. Анамастыка, тэрміналогія і фразеалогія : вучэбна-метадычны дапаможнік / М. У. Буракова, В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукцыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны". - Мінск : РІВШ, 2011. - 165 с. - Бібліягр. : с. 128-132. - Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)".
14. Кулікові, У. І. Правілы сучаснай беларускай арфаграфіі : Вучэбны дапаможнік / У. І. Кулікові. - Мінск : Новое знание, 2011. - 222 с.
15. Ляшчынская, В. А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэбны дапаможнік / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.

16. Ляшчынская, В. А. Сучасная беларуская мова: фразеалогія : вучэбны дапаможнік / В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукцыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны". - Мінск : РІВШ, 2010. - 229 с. - Библиогр. : с. 168-177. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі РБ у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйіных навучальных ўстаноў па філалагічных спецыяльнасцях.
17.Руденко Е. Н. Белорусский язык. Профессиональная лексика : учеб. пособие для студ. вузов / Е. Н. Руденко, А. А. Кожинова, Е. Г. Задворная. - Мн. : ТетраСистемс, 2005. - 381 с.
18.Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі. – Мінск. 1999

**Слоўнікі:**

19. Арашонкава, Г. У. Кароткі слоўнік беларускай мовы. Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Славаўжыванне / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова. – Мінск, 1994.
20. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1996–2004.
21. Булыка, А. М Слоўнік інінамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск, 1999.
22. Геаграфічныя паняцці і тэрміны: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: М. М. і інш. . – Мінск, 1993.
23. Граматычны слоўнік дзеяслова. – Мінск, 2007.
24. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. . – Мінск. 1995.
25. Руска-беларускі слоўнік: у 3 т. – Мінск, 1995.
26. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / пад рэд. М. В. Бірылы. – Мінск, 1987.
27. Социологическая энциклопедия / под. общ. ред. А. Н. Данилова. – Минск, 2003.
28. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск, 1977–1984.
29. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. – Мінск, 2005.
30. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1984–1987.
31. Энцыклапедыя прыроды Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1983–1986.
32. Этнаграфія Беларусі. – Мінск, 1989.
33. Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік. – Мінск, 1992.

# ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАЛІКА

1. Беларуская нацыянальная мова, яе формы. Функцыі мовы ў грамадстве.
2. Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы.
3. Паняцце моўнай нормы. Сістэма норм літаратурнай мовы.
4. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.
5. Некаторыя аспекты функцыянавання беларускай і рускай моў. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння.
6. Марфалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
7. Сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў. Адрозненні ў будове некаторых словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах.
8. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў.
9. Навуковы стыль, яго функцыі і характэрныя асаблівасці.
10. Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (даклад, артыкул, рэферат,анатацыя, рэзюмэ), агульныя патрабаванні да іх напісання і афармлення.
11. Лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
12. Афіцыйна-справавыя дакументы, правілы іх напісання і афармлення.
13. Мова і маўленне. Віды і тыпы маўлення. Адзінкі маўлення.
14. Дакладнасць выказвання і моўныя нормы.Маўленчы этыкет і культура зносін.

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Пры вывучэнні дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя формы самастойнай працы: складанне канспекта-прэзентацыі, праца з прафесійнымі тэкстамі, складанне тэрміналагічнага слоўніка па спецыяльнасці, праца з электроннымі перакладчыкамі.

**Змест самастойнай працы студэнтаў**
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| Від самастойнай працы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| | Модуль 1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых інацыянальных каштоўнасцей. | |
| Складанне канспекта-прэзентацыі | **Тэма 2. Сучасная беларуская мова.**<br>«Сацыяльна-палітычныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы на сучасным этапе».<br>Асн. літаратура: [1], [2]<br>Дад. літаратура: [11]. | 4 |
| | Модуль 2. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы | |
| Праца з прафесійнымі тэкстамі | **Тэма 2. Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы.**<br>Асн. літаратура: [1], [4]<br>Дад. літаратура: [10]. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Спецыяльная лексіка.**<br>Асн. літаратура: [1], [2]<br>Дад. літаратура: [10]. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення.**<br>Асн. літаратура: [1], [4]<br>Дад. літаратура: [6], [8]. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Спосабы і сродкі ўтварэння тэрмінаў розных галін дзейнасці.**<br>Асн. літаратура: [1], [3]<br>Дад. літаратура: [6], [8]. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Гісторыя і сучаснасць беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі.**<br>Асн. літаратура: [1], [2]<br>Дад. літаратура: [16]. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 4. | **Лексікаграфія.**<br>Асн. літаратура: [1], [2]<br>Дад. літаратура: [13], [14]. | 2 |
| | Усяго гадзін | **20** |

# КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

У рамках рэйтынгавай сістэмы дыягностыка якасцей засваення ведаў у студэнтаў па дысцыпліне складаецца з двух кампанентаў:

1. вынікаў бягучага кантролю на працягу семестра;
2. прамежкавай атэстацыі.

Мерапрыемствы бягучага кантролю праводзяцца на працягу семестра ў форме кантролю: пераклад прафесійных тэкстаў, складанне прафесійных слоўнікаў, рэфераты, напісанне анатацыі, рэзюме.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў форме заліка. Вынікі бягучага кантролю за семестр ацэньваюцца адзнакай у балах па дзесяцібальнай шкале і выводзіцца, зыходзячы з адзнак, якія выстаўляюцца выкладчыкам у ходзе правядзення мерапрыемстваў бягучага кантролю на працягу семестра па формуле:

$$БК = Б1+Б2+Б3 ........+ Бn / n,$$

дзе Б1,2…n – адзнака за мерапрыемства бягучага кантролю,

n – колькасць мерапрыемстваў бягучага контролю.

Дадзеная адзнака таксама ўлічвае вынікі ўдзелу студэнта ў навукова-практычных мерапрыемствах, вучэбна-даследчай, навукова-даследчай працы студэнтаў (канферэнцыях, семінарах, алімпіядах, конкурсах, навуковых гуртках і г.д.) па профілю дысцыпліны і можа быць павышана да 10 балаў пры дасягненні значных вынікаў у гэтай працы.

Для студэнта, які прапусціў мерапрыемства бягучага кантролю па ўважлівай прычыне, кафедрай устанаўліваюцца дадатковыя тэрміны. Студэнтам, якія прапусцілі мерапрыемства бягучага кантролю без уважлівай прычыны, выстаўляецца 0 (нуль) балаў за гэтае мерапрыемства.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў форме заліка. Залік носіць накапляльны характар па выніках мерапрыемстваў бягучага кантролю.

«Залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі па выніках мерапрыемстваў бягучага кантролю выніковую адзнаку ад 4 да 10 балаў.

«Не залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі ад 1 да 3 балаў. Апошнія здаюць залік другі раз па прапанаваных пытаннях да заліку.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ЗІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне,прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| | Кафедра энергетыкі і электронікі | Предложений и замечаний нет | |

Загадчык кафедры
энергетыкі і электронікі,
к.т.н., дацэнт Д.А. Даўгяла